**Алесь Смалянчук**
(Гародня)

# Род Скірмунтаў у беларускай гісторыі

Існуе некалькі версій пачаткаў радаводу Скірмунтаў. Легендарная версія звязана з паданнем пра перасяленне (а дакладней, уцёкі) шматлікіх родаў рымскай арыстакратыі на тэрыторыю Жамойці. Узначальваў гэтыя ўцёкі князь Палемон. Упершыню згадкі пра рымскае паходжанне магнатэрыі і шляхты ВКЛ сустракаюцца ў працах Яна Длугаша (1415–1480)[1]. Ён аднёс гэтыя падзеі да часоў Цэзара. Імя Палемона і яго спадарожнікаў не называлася. Канчатковае афармленне легенды адбылося прыблізна ў сярэдзіне XVI ст. Існуе некалькі яе варыянтаў. Паводле аднаго з іх, гэтыя ўцёкі адбыліся ў I ст. н.э., і іх прычынаю была жорсткасць імператара Нерона. Варыянт М. Стрыйкоўскага (пазней пераказаны ў *Хроніцы Быхаўца*[2]) адносіць гэтыя падзеі да 401 г., і звязвае іх прычыны з жорсткасцю ўжо правадыра гунаў Атылы. Паводле легенды, уцекачы прыбылі морам у Прыбалтыку, падняліся па Нёмане да р. Дубісы, і там спыніліся. Менавіта яны далі назву „Жамойць” гэтым землям.

Легенда дала падставы некаторым даследчыкам распачаць гісторыю роду Скірмунтаў ад вялікага князя наваградскага Скірмунта (Скірманта), які быў унукам вялікага князя наваградскага Эрдзівіла, які, у сваю чаргу, прыходзіўся праўнукам самому

[1] В. Пазднякоў, *Палемон*, [у:] *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі* (далей: *ЭГБ*), т. 5, Мінск 1999, с. 384.

[2] *Хроника Быховца*, с. 18–19, [у:] http://starbel.narod.ru/byh.htm

Палемону. У XVII ст. гэтую легенду пераказаў Войцех Віюк-Каяловіч у кнізе *Herbarze rycerstwa W. X. Litewskiego*[3]. Пра яе ж згадаў напрыканцы XIX ст. Т. Жыхліньскі ў выданні *Złota księga szlachty polskiej*[4]. Ён, дарэчы, з сумненнем паставіўся да тэзісу пра князя наваградскага Скірмунта як пачынальніка роду Скірмунтаў. Пэўны водгук гэтая легенда атрымала ў выданні *Materiały do biografii i genealogii i heraldyki* (пад рэд. Шымона Канарскага). У тэксце пра Скірмунтаў сцвярджалася, што яны паходзяць з роду ўдзельных князёў Літвы, Жамойці і Русі, якія некалі былі падзеленыя паміж трыма братамі. Таксама ён згадаў пра іх сястру манахіню Пракседу, якая была фундатарам базыльянскага кляштара ў Полацку[5].

Таксама выразны легендарны характар носіць сцвярджэнне польскага публіцыста, грамадскага і рэлігійнага дзеяча Валяр'яна Мэйштовіча, які ў зборніку кароткіх эсэ, прысвечаных вядомым родам літоўскіх і беларускіх палякаў, звязаў паходжанне Скірмунтаў з яцвягамі[6]. Гэты род нібыта выводзіцца з рэшткаў вынішчаных дружынамі Лешка Белага яцвяжскіх плямёнаў. Сам аўтар прызнаў, што гістарычныя дадзеныя, якія б яе пацвердзілі, адсутнічаюць*. Можна было б і не звяртаць на яе ўвагі, але падобна, што гіпотэза В. Мэйштовіча была даволі распаўсюджанай у асяродку літоўскіх палякаў XIX – пачатку XX стст.

Адным з першых даследчыкаў радаводу Скірмунтаў быў ужо згаданы Войцех Віюк-Каяловіч, які паведаміў пра ковенскага стольніка Мікалая Скірмунта і Базыля Скірмунта з Берасцейскага ваяводства. Апошні меў сыноў – Іяхіма, Яна (дэпутата вялікага трыбунала 1685 г.) і Стэфана (гусарская каралеўская рота

[3] *Ks. Wojciecha Wijuka Kojałowicza S. J. Herbarz rycerstwa W. X. Litewskiego tak zwany Compendium czyli o klejnotach albo Herbach, których familie stanu rycerskiego w prowincyach Wielkiego Xięstwa Litewskiego zażywają*, Kraków 1897, s. 527.

[4] *Złota księga szlachty polskiej przez T. Żychlińskiego. Rocznik pierwszy*, Poznań 1879, s. 284–285.

[5] *Materiały do biografii, genealogii i heraldyki polskiej*, t. II, red. S. Konarski, Buenos Aires – Paryż 1964, s. 44.

[6] W. Meysztowicz, *Poszło z dymem. Gawędy o czasach i ludziach*, Londyn 1973, s. 114–115.

* У другой палове XX ст. гіпотэза пра яцвяжскае паходжанне Скірмунтаў знайшла адлюстраванне ў рамане Р. Красько *Skirmunt syn Kumata* (Warszawa 1973, ss. 328). Галоўная сюжэтная лінія рамана прысвечана лёсу ганарлівага яцвяжскага князя Скірмунта, які ў рэшце рэшт прызнаў сябе васалам Пястаў і стаў бараніць усходнія межы іх уладанняў.

Крыштафа Белазора). В. Каяловіч таксама згадаў жмудскага каноніка ксяндза Валянтына Скірмунта, ахарактарызаваўшы яго як „каплана вучонага”[7]. Пры гэтым ён заўважыў, што Скірмунты, якія прынялі прозвішча Стравінскіх пасля набыцця маёнтка Страўнік, карыстаюцца гербам „Прыяцель” („Przyjaciel” – у блакітным полі два чырвоныя сэрцы, паміж імі дзве сярэбраныя стралы ўгару, наверсе рыцарскі шлем з трыма страусінымі пер'ямі[*]).

Каспар Нясецкі ў кнізе *Herbarz polski* сцвярджаў, што герб „Прыяцель” Скірмунты пачалі ўжываць пасля Люблінскай уніі (1569), як сімвал сяброўства з тымі польскімі шляхецкімі родамі, з якімі былі звязаныя сваяцкімі сувязямі. Магчыма, перамена герба была звязана з набыццём маёмасці Страўнік. Раней усе Скірмунты карысталіся гербам „Дуб” („Dąb” – у чорным[**] полі залаты дуб з пяццю каранямі, двума лістамі на сярэдзіне ствола і трыма жалудамі замест верхавіны, наверсе княжацкая мітра[***]). К. Нясецкі дадаў, што апошні герб яшчэ ўжываюць многія прадстаўнікі роду, асабліва тыя, што маюць уладанні на Піншчыне. Сучасныя даследчыкі Ян Цехановіч і Эдмундас Рымша выказалі сумненне наконт ужывання Скірмунтамі герба „Дуб”. На іх думку, Скірмунты хутчэй ужывалі герб „Godzięba”. Я. Цехановіч пры гэтым спаслаўся на радавод Скірмунтаў, які быў зацверджаны ўладамі ў 1819 г.[8] Паводле Э. Рымшы, герб „Godzięba” ў 1413 г. у Гародле атрымаў нехта Ст. Бутаўтовіч.

Услед за В. Каяловічам Каспар Нясецкі сярод першых вядомых Скірмунтаў таксама назваў Базыля з Берасцейшчыны (1632) і Мікалая са Жмудзі (1621). Паводле яго звестак апошні, які быў спачатку падстарастам, а потым ковенскім стольнікам, удзельнічаў у падпісанні т.зв. pacta conventa Яна Казіміра (1648–1668). Апроч іх К. Нясецкі назваў Іяхіма Скірмунта, яго сына Валянтына (пінскі абозны, індурскі староста), а таксама жмудскага каноніка, жмудскага суфрагана, а пазней Уцянскага біскупа

[7] *Ks. Wojciecha Wijuka Kojałowicza S. J. Herbarz rycerstwa...*, s. 246.

[*] Віленскі даследчык Эдмундас Рымша называе гэтую адмену „Прыяцеля” „літоўскай”.

[**] Ш. Канарскі лічыць, што герб „Дуб” у Скірмунтаў меў блакітнае поле (*Materiały do biografii i genealogii...*, s. 44).

[***] Паводле нямецкага даследчыка Э. Жарніцкага-Шэлігі гэты герб вядомы з 1340 г. (*Die polnischen Stammwappen ihre Geschichte und ihre Sagen Von Emilian von Żernicki-Szeliga*, Hamburg 1904, s. 21).

[8] J. Ciechanowicz, *Rody rycerskie...*, s. 96.

Іяхіма Скірмунта (памёр у 1718 г.), Крыштафа Скірмунта, які ў 1778 г. займаў пасаду гродскага ашмянскага суддзі. Ён жа згадаў пра земскага пінскага суддзю Адама Скірмунта (канец XVIII ст.), пінскага мастаўнічага Шымона, інфлянцкага стражніка Зыгмунта і ашмянскага суддзю Юзафа (1788)[9].

Даследчыкі XIX–XX стст., якія ў сваіх працах закраналі праблему радаводу Скірмунтаў, выкарыстоўвалі матэрыялы справы аб пацвярджэнні іх шляхецтва. Ужо згаданы Т. Жыхліньскі сцвярджаў, што зацверджаны радавод Скірмунтаў распачынаецца з плотніцкага[*] старасты Крыштафа Скірмунта[10].

Адам Банецкі прывёў звесткі пра Богуша Скірмонта (Скірманта?), які ў 1543 г. займаў пасаду пінскага падстарасты. Паводле інфармацыі даследчыка, у 1551 г. Богуш Скірмонт (Скірмант?) вёў судовы працэс супраць Капусцічаў, каб адабраць маёнтак Тарасава[**][11].

Ковенскі падстолі Мікалай Скірмунт, які падпісаў pacta coventa Яна Казіміра, таксама згадваецца ў кнізе *Herbarz polski i imionopis zasłużonych w Polsce ludzi*[12].

Шыман Канарскі звярнуў увагу, што асноўныя ўладанні Скірмунтаў знаходзяцца ў Жамойці, а таксама ў Пінскім, Гарадзенскім і Ашмянскім уездах. Ён жа сцвярджаў, што першапачаткова ўладанні Скірмунтаў, а менавіта маёнткі Лінкава[***], Лінкавец, Будкішкі (Буткішкі) і Скірмунцішкі месціліся ў Жамойці. Аднак Міхал Скірмунт перабраўся ў Інфлянты, дзе набыў маёнтак Велёны, які, пазней, быў прададзены яго сынамі. Аднак, паводле даследчыка, у Інфлянтах засталіся інфлянцкі каморнік, наваградскі ротмістр і сакратар земскай пячаткі Дзвінскай

[9] *Herbarz polski Kaspra Niesieckiego S. J. powiększony dodatkami z późniejszych autorów, rękopisów, dowodów urzędowych*, t. VIII, Lipsk 1841, s. 380–381.

[*] На карце-дадатку да кнігі Міхаіла Спірыдонава *Закрепощение крестьянства Беларуси (XV-XVI вв.)*, выдадзенай у Мінску ў 1992 годзе, Плотніца знаходзіцца паміж Пінскам і Давыд-Гарадком.

[10] *Złota księga szlachty...*, s. 284–285.

[**] На карце М. Спірыдонава пазначана толькі мястэчка Тарасава, якое знаходзілася прыблізна ў 10 км на захад ад Мінска.

[11] *Poczet rodów w Wielkim Księstwie Litewskim w XV i XVI w.*, ułożył i wydał Adam Boniecki, Warszawa 1883, s. 314.

[12] *Herbarz polski i imionopis zasłużonych w Polsce ludzi wszystkich stanów i rodów*, t. III, Lwów, 1862, s. 60.

[***] На карце М. Спірыдонава в. Лінкава знаходзіцца ў Жамойці, прыблізна ў 40 км на паўночны ўсход ад Шаўляў.

правінцыі Адам Скірмунт, харунжы польскіх войскаў Тадэвуш Скірмунт, а таксама Ян і Якуб Скірмунты, якія таксама знаходзіліся на вайсковай службе. Яны, як і Скірмунты з Піншчыны, захавалі герб „Дуб”[13].

Яшчэ адна лінія роду Скірмунтаў мела татарскае паходжанне. Станіслаў Дзядулевіч у кнізе *Herbarz rodzin tatarskich w Polsce* распавёў пра татарскі княжы род Кадышэвічаў (przydomek Aksak-Emirza). Прадстаўнікі гэтага роду сыны найманскага харунжага Асана, а менавіта Абрахім і Багдан і іх пляменнік Алей Ахміцевіч у 1631 г. прынялі прозвішча Скірмунт. Па меркаванню даследчыка, у XVII ст. падобнае адбывалася даволі часта. Прадстаўнікі татарскіх родаў Рэчы Паспалітай імкнуліся такім чынам падкрэсліць уласную лаяльнасць у адносінах да дзяржавы. Зразумела, што без дазволу Скірмунтаў гэтая перадача прозвішча была б немагчымай. Пры гэтым Кадышэвічы захавалі ўласны герб, які з гэтага часу пачаў называцца герб „Скірмунт”. Паводле С. Дзядулевіча, Скірмунты татарскага паходжання пражывалі пераважна на Гарадзеншчыне[14].

Ян Цехановіч, які вывучаў справу Дэпартамента герольдыі аб пацвярджэнні шляхецтва Скірмунтаў (LVIA, f. 391), сцвярджаў, што родапачынальнікам з’яўляецца Мацей Скірмунт (герб „Дуб”), які валодаў маёнткам Буткішкі (Будкішкі) у Жамойці[15]. Яго сын Ян, які атрымаў у спадчыну бацькоўскія землі, павялічыў зямельныя ўладанні сям’і маёнткамі Кольні (Кольна*?) і Пашкевічы. Апошнія знаходзіліся на Піншчыне. Пасля смерці Яна Скірмунта маёнткі адышлі да яго сына Пятра. Гэта пацвярджаюць акты ад 1676 і 1684 г. Другі сын Міхал перасяліўся ў Інфлянты, дзе стаў уладальнікам маёнтка Велёны. Ад шлюбу з Альбрэхтоўнай нарадзіліся тры сыны – Зыгмунт, Караль і Багуслаў. Ян Цехановіч са спасылкай на працу: I. A. Hylzen, *Inflanty* (Wilno 1750, t. II, s. 24) адзначыў, што Скірмунты займалі высокія выбарчыя пасады ў Княстве Інфлянцкім і мелі шматлікіх нашчадкаў. Некаторыя з іх засталіся ў Інфлянтах. Іншыя перасяліліся за межы княства. Напрыклад, Стэфан Багуслававіч Скірмунт перабраўся ў Вільню, дзе ажаніўся з Багуславай

[13] *Materiały do biografii i genealogii...*, s. 44.

[14] *Herbarz rodzin tatarskich w Polsce*, opr. Stanisław Dziadulewicz, Wilno 1929, s. 295.

[15] J. Ciechanowicz, *Rody rycerskie Wielkiego Księstwa Litewskiego*, t. V, S–Ż, Rzeszów 2001, s. 96–97.

* Адзінае Кольна, якое можна знайсці на карце М. Спірыдонава, знаходзілася ў 15 км на паўночны ўсход ад Турава.

Садоўскай. Ад гэтага шлюбу нарадзіліся сыны Ян (на момант выдання кнігі І. Гільзэна ўжо не жыў), Юзаф, Міхал і дачка Феліцыяна[16].

Беларускі гісторык Уладзіслаў Вяроўкін-Шэлюта таксама прытрымліваецца думкі пра жамойцкае паходжанне роду Скірмунтаў. На яго думку, яны паходзяць з Упіцкага павета. Ён жа лічыць пачынальнікам пінскай лініі роду Богуша Скірманта. Аднак у адрозненні ад А. Банецкага даследчык сцвярджаў, што Богуш быў давыд-гарадоцкім падстарастам, які ў 1552 г. атрымаў ад каралевы Боны маёнтак Плотніца ў Пінскім павеце[17]. Нашчадкі Богуша Скірмунта шляхам куплі і шлюбаў значна пашырылі родавыя ўладанні на Піншчыне.

Шыман Канарскі сцвярджаў, што ўладанні першых вядомых нам Скірмунтаў знаходзіліся ў Жамойці, верагодна, у Паневежскім (Лінкава і Лінкавец) і Росенскім (Буткішкі і Скірмантышкі) паветах. Яшчэ адны Скірмантышкі належалі да Ковенскага павета, а Скірмунцішкі – да Ашмянскага. Даследчык таксама адзначыў, што ў 1866 г. Скірмунты валодалі маёнткам Сродополь у Дынабургскім павеце[18]. У *Polskiej encyklopedii szlacheckiej* адзначаюцца маёнткі Скірмунтова ў Ашмянскім і Пінскім паветах, якія належалі да Скірмунтаў герба „Прыяцель”, і маёнткі з такой самай назвай у Менскім і Астрожскім (?) паветах, што належалі Скірмунтам герба „Дуб”[19].

У. Вяроўкін-Шэлюта сцвярджаў, што пінскі гараднічы Аляксандр Скірмунт меў асноўныя ўладанні ў Пінскім павеце (маёнткі Сушыцк*, Выласкія Увалокі, Кашэвічы, Цмень, Ругаз, Лугаж, Плотніца), а таксама валодаў землямі ў Жамойці, Ашмянскім павеце, Менскім і Кіеўскім ваяводствах[20].

Звесткі пра размеркаванне зямельных уладанняў Скірмунтаў не пярэчаць версіі пра жамойцкія карані роду Скірмунтаў. Тое ж ускосна пацвярджаюць дадзеныя пра сучаснае распаўсюджанне прозвішча Скірмунт. Найчасцей яно сустракаецца ў раёне невялікага гарадка Рэтавас, які знаходзіцца амаль у „сэрцы” Жамойці, на тэрыторыі т.зв. Жамойцкага ўзвышша. Найбольш пашыраная літоўская форма гэтага прозвішча – Скірмантас. Этымалогія таксама хутчэй за ўсё звязаная з літоўскай мовай. Па меншай

[16] Там жа.
[17] У. Вяроўкін-Шэлюта, *Скірмунты*, [у:] *ЭГБ*, т. 6, Мінск 2001, с. 321.
[18] *Materiały do biografii i genealogii...*, s. 44.
[19] *Polska encyklopedia szlachecka*, t. XI, Warszawa 1988, s. 71.
* На карце М. Спірыдонава – у 10 км на паўночны ўсход ад Пінска.
[20] У. Вяроўкін-Шэлюта, *Скірмунты...*, с. 321.

меры можна сцвярджаць, што прозвішча Скірмантас складаецца з двух каранёў: *skir-* (skirti, г.зн. раздзяляць альбо падзяляць) і *man-* (manyti, г.зн. думаць, мець меркаванне)[21].

У пераліку найбольш вядомых Скірмунтаў XVIII ст. У. Вяроўкін-Шэлюта ўказаў пінскага абознага, скарбніка (з 1720 г.), гараднічага (з 1726 г.) Аляксандра (памёр да сакавіка 1746 г.), яго ўнука пінскага каморніка гранічнага (з 1778 г.), мастаўнічага (з 1793 г.) і харунжага Аляксандра (памёр да чэрвеня 1801 г.). Апроч таго ён згадаў сыноў Аляксандра – пінскага падсудка (1799–1805) і падкаморага (1820–1826) Каспара Вінцэнта (нар. 4 студзеня 1775 г.) і лаўніка пінскага павятовага земскага суда, пазней суддзю, прэзідэнта межавага пінскага суда Амброжыя Вінцэнта (нар. 4 красавіка 1776 – памёр да 1840 г.), сына Міхала Скірмунта – пінскага канюшага (з 1765 г.), земскага суддзі (з 1790 г.), падкаморага (з 1811 г.), дэпутата соймаў Рэчы Паспалітай 1773–1775 гг. і 1793 г., сябра Пастаяннай Рады Рэчы Паспалітай (з 1794 г.) Адама Скірмунта (памёр да студзеня 1820 г.), які да таго ж меў непасрэднае дачыненне да будаўніцтва Канала Агінскага. Таксама трэба назваць сына Адама Скірмунта, Аляксандра (памёр да 1866 г.), які займаў пасады пінскага харунжага (з 1814 г.) і маршалка (1823–1829), адначасова (з 1820 г.) быў лаўнікам менскага галоўнага суда і менскай палаты крымінальнага суда. Яго брат Адам (нар. 25 жніўня 1793 г.) закончыў Віленскі ўніверсітэт, быў кандыдатам філасофіі (1811), пазней займаў пасады пінскага выводнага дэпутата (1811) і маршалка (1814–1817). Вартай увагі таксама з'яўляецца асоба Сымона Скірмунта (нар. у 1851 г.), які быў сынам Ігнація, і займаў пасады пінскага мастаўнічага (з 1776 г.), мечніка (з 1790 г.), падчашага (з 1793 г.), каралеўскага камісара (у 1790 г.), берасцейскага маршалка (у 1799 г.), дэпутата Трыбунала ВКЛ (1766), дэпутата на Чатырохгадовы сейм 1788–1792 гг. (з 1790 г.)[22]. Асоба Сымона Скірмунта цікавіць яшчэ і таму, што менавіта ён набыў ад Агінскіх маёнткі Моладава і Парэчча, з якімі непарыўна звязаны лёс Скірмунтаў эпохі найноўшай гісторыі.

Найбольш прыкметны след у гісторыі пакінулі Скірмунты XIX–XX стст., жыццё якіх было звязана з Піншчынай, а дакладней з маёнткамі Парэчча Пінскага ўезда Менскай губерні і Моладава Кобрынскага ўезда Гарадзенскай губерні. Гэтыя землі напрыканцы XVIII ст. Сымон Скірмунт выкупіў у Агінскіх.

[21] *Lietuvių pavardžių žodynas*, t. 2, Vilnius 1989, p. 152–153, 742–743.

[22] Там жа, с. 321–322.

Агінскія аказаліся не вельмі добрымі гаспадарамі. Маёнткі не толькі не давалі прыбытку, а былі яшчэ абцяжараныя вялізнымі даўгамі. Сын Сымона, Аляксандр Ісідар Скірмунт (1(21?) студзеня 1799 – 22 ліпеня 1870) здолеў ператтварыць гэтыя землі ў свайго роду плацдарм капіталістычнай гаспадаркі ў Беларусі. Асаблівую славу набыла суконная фабрыка, пабудаваная ў Парэччы. У шлюбе з Канстанцыяй Сулістроўскай нарадзілася 11 дзяцей[23]. Гэта Казімір (1824–1880), які ўдзельнічаў у паўстанні 1863 г. і быў высланы ў Сібір, Канстанцін (нар. у 1828 г.), што валодаў маёнткам Шэметаўшчына ў Свянцянскім уездзе, дзе заснаваў крэдытную суполку з удзелам сялянаў, Аляксандр (1830–1909), Сымон (1835–1902) – уладальнік маёнтка Клетня, мастак, Генрык (нар. у 1836 г.) – уладальнік Моладава і Зыгмунт (нар. у 1839 г.), дачкі Караліна (нар. у 1824 г.), Антаніна (нар. у 1825 г.), Эмілія (нар. у 1833 г.), Канстанцыя і Гартэнзія, якая памерла ў маладосці.

Варта звярнуць увагу на асобу Аляксандра, які быў уладальнікам маёнтка Парэчча, дзе з поспехам працягваў прадпрымальніцкую ініцыятыву бацькі. Падчас адмены прыгоннага ладу займаў пасаду міравога суддзі і вёў актыўную грамадскую дзейнасць, за якую заслужыў любоў і павагу навакольнага сялянства. У шлюбе з Тэафілай Любаньскай нарадзілася 9 дзяцей, адным з якіх быў Раман Скірмунт (1868–1939) – самы вядомы прадстаўнік роду ў беларускай гісторыі. Разам з ім у Парэцкім маёнтку выхоўваліся яго браты Аляксандр, Вацлаў, Зянон і сёстры Тэафіла, Браніслава, Ванда, Феліцыя і Галена[24].

У суседнім Моладаве ў шлюбе Генрыка Скірмунта з Марыяй Твардоўскай нарадзілася 4 дзяцей – Канстанцін, Генрык, Марыя і Ядвіга. Кастанцін Скірмунт з 1909 г. па 1917 г. быў сябрам Дзяржаўнай Рады Расійскай Імперыі, у 1917 г. стаў адным з заснавальнікаў Польскага нацыянальнага камітэта і яго прадстаўніком у Рыме, у 1919–1921 гг. – польскі пасол у Італіі, у 1921–1922 гг. – міністр замежных справаў, пазней (да 1934 г.) – пасол у Вялікабрытаніі. Яго брат Генрык (1868–1939) увайшоў у польскія энцыклапедыі як паэт і кампазітар.

Лёс распарадзіўся так, што практычна ніхто з парэцкіх і моладаўскіх Скірмунтаў не меў дзяцей, па меншай меры, дзяцей у шлюбе. Забойствы ў Парэччы Рамана і Баляслава ў 1939 г.

[23] S. Konarski, *Skirmunt Aleksander (1798–1970)*, [w:] *Polski Słownik Biograficzny*, t. XXXVIII/2, zeszyt 158, s. 175.

[24] *Złota księga szlachty...*, s. 284–285.

і Галены ў 1942 г.(?), забойствы ў Моладаве Генрыка і Марыі ў 1939 г. фактычна перарвалі гэтыя лініі роду Скірмунтаў.

Сярод іншых вядомых прадстаўнікоў роду перыяду XIX–XX стст. трэба назваць мастачку і скульптара Галену Скірмунт (1827–1874), якая ўдзельнічала ў паўстанні 1863 г. і была выслана ў Сібір, і яе дачку вядомую грамадскую дзяячку, публіцыстку і гісторыка Канстанцыю Скірмунтт (1852–1934). Сын уладальніка Шэметаўшчыны Канстанціна Скірмунта і Габрыэлы Умястоўскай Казімір (1861–1931) стаў вядомым юрыстам і рэлігійным дзеячам, які на пачатку XX ст. быў пасрэднікам паміж польскім епіскапатам і Апостальскай сталіцай, а ў 1919 г. заняў пасаду кананічнага дарадцы пасольства II Польскай Рэспублікі ў Ватыкане[25].

У энцыклапедычных выданнях Польшчы змяшчаліся артыкулы, прысвечаныя Аляксандру Сымонавічу Скірмунту (1798–1870), літаратару і кампазітару Генрыку Скірмунту (1868–1939), грамадскай дзяячцы Канстанцыі Скірмунтт[26], а таксама палітыку і дыпламату Канстанціну Скірмунтту[27]. У *Польскім слоўніку біяграфічным* апроч згаданых асобаў змешчаныя біяграфіі сябра Пастаяннай Рады Рэчы Паспалітай Адама Скірмунта, ксяндза-юрыста Казіміра Скірмунта, прэм'ер-міністра БНР (травень-жнівень 1918 г.) Рамана Скірмунта і мастачкі Галены Скірмунт[28]. У *Энцыклапедыі гісторыі Беларусі* (том 6, Мінск 1999, с. 321–322) змешчаны артыкул С. Рудовіча, прысвечаны Раману Скірмунту і артыкул У. Вяроўкіна-Шэлюты *Скірмунты.* У апошнім згадваюцца найбольш вядомыя прадстаўнікі роду з XVIII – па XX стст.

Скірмунты не належалі да арыстакратыі і магнатэрыі ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Гэта быў сярэднезаможны шляхецкі род, які толькі ў XIX ст. пачаў адыгрываць больш-менш прыкметную ролю ў гаспадарчым развіцці Беларусі, і толькі ў XX ст. прадстаўнік роду (Раман Скірмунт) стаўся адным з найбольш вядомых беларускіх палітыкаў.

[25] H. Fokciński, *Skirmunt Kazimierz (1861–1931)*, [w:] *Polski Słownik Biograficzny*, t. XXXVIII/2, zeszyt 158, s. 177–178.

[26] S. Orgelbrandt, *Encyklopedia powszechna z ilustracjami i mapami*, t. XIII, Warszawa 1902, s. 534.

[27] Напрыклад, *Ilustrowana encyklopedia powszechna*, oprac. pod red. dra M. J. Wachtla, N–Z, wyd. II, Warszawa 1937, s. 660; *Ilustrowana encyklopedia Trzaski, Everta i Michalskiego*, oprac. pod red. dra St. Lama, t. V, Si–Z, b.m.w. 1996, s. 48; *Wielka ilustrowana encyklopedia powszechna*, t. XVI, Kraków 1995, s. 69.

[28] *Polski Słownik Biograficzny*, t. XXXVIII/2, z. 158, s. 173–190.